

*Цэнтральная гарадская бібліятэка імя. А.І. Герцэна*

**ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АДДЗЕЛ**

# Патрыярх беларускай сатыры

да 120-годдзя з дня нараджэння К. Крапівы

(Бібліяграфічны спіс)



Гомель, 2016

Патрыярх беларускай сатыры : да 120-годдзя з дня нараджэння К. Крапівы : бібліяграфічны спіс / Цэнтральная гарадская бібліятэка імя. А.І. Герцэна, інфармацыйна-бібліяграфічны аддзел; склад. Дз. І. Мельнічэнка; адказ. за вып. Ж.М. Еўдачэнка. — Гомель, 2016. — 13 с.

Спіс уключае нарыс жыцця і творчасці, бібліяграфічную інфармацыю аб найбольш значных выданнях твораў літаратара і матэрыялах пра лёс Кандрата Крапівы.

# Нарыс жыцця і творчасці

Беларуская літаратура багатая на таленавітыя асобы, але і сярод іх творчая індывідуальнасць Кандрата Крапівы ўзвышаецца велічна, непаўторна, ярка.

Нарадзіўся будучы пісьменнік 5 сакавіка 1896 года ў вёсцы Нізок на Уздзеншчыне ў сялянскай сям'і. Сапраўднае яго прозвішча Атраховіч Кандрат Кандратавіч. Скончыў царкоўнапрыходскую школу, народнае вучылішча ў Уздзе. Экстэрнам здаў экзамены на званне народнага настаўніка і восенню распачаў настаўніцкую працу ў Мнішанскім земскім народным вучылішчы Мінскага павета, але праз год быў вымушаны апрануць вайсковы шынель. Далей – Першая сусветная вайна, служба ў Чырвонай Арміі, удзел у Грамадзянскай вайне…

У 1925 г. паэт пераехаў ў Мінск. Стаў членам літаратурнай арганізацыі «Маладняк», затым – «Узвышша», працаваў інструктарам Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры, потым – загадчыкам аддзела ў часопісе «Полымя рэвалюцыі». Ужо сталым чалавекам К. Крапіва паступіў на лінгвістычнае аддзяленне педагаічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якое скончыў у 1930 г. У 1939 г. К. Крапіва ўдзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайне. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён працаваў у рэдакцыі газеты «Красноармейская правда», затым у рэдакцыі франтавой газеты Заходняга фронту «За Савецкую Беларусь». З сакавіка 1943 і да канца вайны быў адказным рэдактарам ілюстраванай сатырычнай газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Адразу пасля вайны яго прызначылі адказным рэдактарам сатырычнага часопіса «Вожык».

Літаратурная дзейнасць К. Крапівы пачалася яшчэ ў Чырвонай Арміі з простай газетнай карэспандэнцыі, фельетонаў на бытавыя і палітычныя тэмы. Пісаў ён тады на рускай мове, але неўзабаве перайшоў на беларускую мову. Свае раннія агітацыйныя, сатырычныя і гумарыстычныя вершы друкаваў на старонках газеты «Савецкая Беларусь». Пасля яны склалі яго першыя зборнікі баек «Асцё» і «Крапіва» (абодва 1925). Пачынаючы з другой паловы 20-х гадоў выходзілі яго зборнікі баек «Біблія» (1926), «Байкі» (1927), «Пра нашых шкоднікаў,

папоў ды ўгоднікаў» (1930), «Ухабы на дарозе» (1930), «Смех і гнеў» (1946), «Жаба ў каляіне» (1857) і шматлікія іншыя.

Байкі – вяршыня шматграннай паэтычнай творчасці К. Крапівы. Мінуў не адзін дзесятак год з часу іх напісання, а яны і сёння захапляюць сваёй мудрасцю, прыгажосцю, свежасцю мастацкіх форм і мовай. У класічны фонд беларускай літаратуры ўвайшлі яго байкі: «Вол і Авадзень», «Варона-мітынгоўшчыца», «Сука ў збане», «Каршун і цецярук», «Дыпламаваны баран», «Сава, Асёл ды Сонца» і іншыя. У ранні перыяд сваёй літаратурнай дзейнасці К. Крапіва паспяхова працаваў і ў галіне мастацкай прозы. Першыя празаічныя творы пісьменніка – сатырычныя мініяцюры, гумарэскі і апавяданні – склалі яго зборнікі «Апавяданні» (1926), «Людзі-суседзі» (1928) і «Жывыя краявіды» (1930). У пачатку 30-х гг. К. Крапіва звярнуўся да новага для яго літаратурнага жанру: пачаў пісаць раман «Мядзведзічы» - пра жыццё і класавую барацьбу сялян. Але твор застаўся незакончаным. Пабачыла свет толькі яго прешая частка, дзеянне ў якой даведзена да пярэдадня калектывізацыі. Раман цікавы тым, што жыццё дакалгаснай вёскі пісьменнік паказвае не ідэалізуючы яго, але і не згушчаючы чорных фарбаў.

Найбольш значнае месца ў творчасці К. Крапівы займае драматургія. З яго п’есамі ў беларускую літаратуру увайшлі героіка і сатыра, лірыка і эпічны эпас, жанравае і стылёвае багацце. Першая п’еса К. Крапівы «Канец дружбы» была напісана ў 1933 годзе і ў конкурсе на лепшую беларускую п’есу атрымала другую прэмію. Потым былі народная драма пра падзеі Грамадзянскай вайны «Партызаны» (1937) і сатырычная камедыя «Хто смяецца апошнім» (1939, Дзяржаўная прэмія СССР 1941), якая па праву лічыцца адным з лепшых здабыткаў усёй савецкай камедыяграфіі. К. Крапіва – аўтар драм «Проба агнём» (1943), «З народам» (1948), «Людзі і д’яблы» (1958), камедыі «Пяюць жаваранкі» (1950, Дзяржаўная прэмія СССР 1951) і інш. Па п’есах «Хто смяецца апошнім» і «Пяюць жаваранкі» зняты аднайменныя фільмы. У 70-я гады К. Крапіва стварыў фантастычную камедыю «Брама неўміручасці» (Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Купалы 1974), у якой востра паставіў пытанне аб сэнсе чалавечага жыцця, месцы чалавека на зямлі. Цёпла была сустрэта публікай яго драма «На вастрыі» (на сцэне вядома пад назвай «Блытаныя сцежкі», 1982). У абодвух гэтых творах аўтар выступае як даследчык сацыяльнай псіхалогіі чалавека і яго грамадскіх паводзін.

П’есы К. Крапівы ставіліся не толькі ў Беларусі, але і на сцэнах Еўропы. А. Макаёнак так сказаў пра творчасць пісьменніка: «Ды ён жа проста герой! Сапраўдны герой! І сапраўды – колькі гарлахвацкіх ён зваліў, паклаў на лапаткі! Колькі туляг ён падняў, страсянуў і паставіў на ногі? Колькі выявіў і высмеяў дыпламаваных бараноў? Колькі жаб пераехала яго сатырычнае савецкае кола?! І заўсёды ў творах Крапівы спадарожнічаюць гнеў і смех. Гнеў і смех!».

К. Крапіва быў не толькі літаратарам. Такая ж шматгранная, змястоўная і глыбокая, як і творчасць, яго навуковая дзейнасць. З 1947 г. ён працаваў у Акадэміі навук БССР, узначальваў мовазнаўчы сектар у Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва, потым Інстытут мовазнаўства, у 1956-1982 гг. быў віцэ-прэзідэнтам АН БССР. К. Крапіва шмат зрабіў для развіцця беларускага мовазнаўства. Ён аўтар прац па беларускай лексікаграфіі, прымаў удзел у стварэнні руска-беларускага і беларуска-рускага слоўнікаў. Выдатны знаўца роднай мовы, пісьменнік узначаліў Тэрміналагічную камісію Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, непасрэдна займаўся пытаннямі распрацоўкі тэрміналогіі ў розных галінах навукі. У 1971 г. за удзел у комплексе работ па беларускай лінгвагеаграфіі яму была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. К. Крапіва – заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1978), Герой Сацыялістычнай Працы (1975). Сведчаннем глыбокага прызнання заслуг К. Крапівы служыць званне народнага пісьменніка Беларусі, прысуджанае яму яшчэ ў 1956 г. Імем К. Крапівы названы Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі.

# Вышыні майстэрства

(Творы К. Крапівы)

1. Арочка, М. М. Судны дзень Скарыны : драматычная паэма / М. Арочка; Купала : трагедыя / А. Дудараў; Маці урагану : трагедыя / Ул. Караткевіч; Хадзілі мы паходамі : драма / І. Чыгрынаў; **Брама неўміручасці** : фантастычная камедыя / К. Крапіва ; маст. І. Дзямкоўскі. – Мінск : Аракул, 1996. – 428 с. – (Школьная бібліятэка).
2. **Крапіва, К.** Байкі : мініяцюрная кніга / Кандрат Крапіва ; мастак І. А. Дзямкоўскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – 127 с.: іл.
3. **Крапіва, К.** Байкі. Вершы. П'есы / Кандрат Крапіва ; афармл. А. Лісічнікава. – Мінск : Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва, 1960. – 211 с.
4. **Крапіва, К.** Байкі і вершы : [для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту] / Кандрат Крапіва; [укладанне Галіны Роліч]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. – 230 с. : іл.
5. **Крапіва, К.** Брама неўміручасці : п’есы / Кандрат Крапіва. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. – 231с.
6. **Крапіва, К.** Брама неўміручасці : камедыі / Кандрат Крапіва. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2015. – 125 с. – (Школьная бібліятэка).
7. **Крапіва, К.** Вершы. Байкі / Кандрат Крапіва ; [уступны артыкул Г. Юрчанкі]. – 2-е выданне, дапоўненае. – Мінск : Народная асвета, 1978. – 128 с. – (Школьная бібліятэка).
8. **Крапіва, К.** Вершы. Байкі. Эпіграмы. Паэмы : для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. – 285 с.: іл, [1] л. партр. – (Школьная бібліятэка).
9. **Крапіва, К.** Выбраныя творы / Кандрат Крапіва. – Мінск : Дзяржвыдат, 1948. – 136 с. – (Бібліятэка школьніка).
10. **Крапіва, К.** Выбраныя творы: у 2 т. / Кандрат Крапіва ; [прадм. Івана Навуменкі]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. – 2 т.
11. Крапіва, К. Выбраныя творы / Кандрат Крапіва; укладанне, прадмова, каментарыі С. Андраюка. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 628 с. : іл. – (Беларускі кнігазбор).
12. **Крапіва, К.** Выбраныя творы : байкі, вершы, эпіграмы / Кандрат Крапіва ; [складальнік Т. У. Люковіч]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2013. – 271 с.

13. **Крапіва, К.** Драматычныя творы / Кандрат Крапіва ; мастак Л. Ліхтаровіч. – Мінск : Белдзяржвыдат, 1951. – 433 с.
14. **Крапіва, К.** Загадкі дзеда Кандрата : [для малодшага школьнага ўзросту] / Кандрат Крапіва ; мастак А. В. Александровіч. – Мінск : Юнацтва, 2002. – 23, [1] с.
15. Крапіва, К. Збор твораў : у 6 т. / К. Крапіва ; [укладанне, прадмова і каментарыі Сцяпана Лаўшука]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. – 2004. – 6 т.
16. **Крапіва, К.** Збор твораў : у 5 т. / Кандрат Крапіва ; рэдактар А. М. Бачыла. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1974 -1976. – 5 т.
17. **Крапіва, К.** Збор твораў : у 4 т. / Кандрат Крапіва ; мастак Г. Клікушын. – Мінск : Дзяржвыдат, 1963. – 4 т.
18. **Крапіва, К.** Збор твораў : у 3 т. / Кандрат Крапіва ; уступны артыкул В. Івашына. – Мінск : Дзяржвыдат, 1956. – 3 т.
19. **Крапіва, К.** Мілы чалавек : камедыя ў трох актах, шасці карцінах / Кандрат Крапіва // Беларуская камедыя / Уклад. Н.І. Семашкевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – С. 269–324.
20. **Крапіва, К.** Мілы чалавек / Кандрат Крапіва // Беларуская камедыя XX стагоддзя. – Мінск: Вышэйшая школа, 1998. – С. 197–258.
21. **Крапіва, К.** Хто смяецца апошнім; Проба агнём; Брама неўміручасці : п’есы : [для старэйшага школьнага ўзросту] / Кандрат Крапіва; [уступны артыкул Дз. Бугаёва]. – Мінск : Юнацтва, 1983. – 188 с. : іл., 1 л. партр. – (Школьная бібліятэка).
22. **Крапіва, К.** Хто смяецца апошнім / Кандрат Крапіва // Беларуская камедыя XX стагоддзя. – Мінск: Вышэйшая школа, 1998. – С. 129–197.

23. **Крапива, К.** Колючий строй : стихи, басни / Кондрат Крапива. – Минск : Мастацкая літаратура, 1989. – 206 с. [1] л. портр. – (Белорусская поэзия).
24. **Крапива, К.** Поют жаворонки : пьеса в четырех актах, шести картинах / Кондрат Крапива ; перевод с белорусского П. Кобзаревского, В. Петушкова. – Минск : Гослитиздат, 1950. – 111 с.
25. **Крапива, К.** Поют жаворонки : комедия в 4 действиях, 5 картинах (вариант для самодеятельного театра) / Кондрат Крапива ; пер. с бел. В. Баскиной, Г. Осипова. – Москва : Издательство культурно-просветительной литературы, 1951. – 64 с. – (Библиотечка «Художественная самодеятельность»).

# Талент шматгранны, самабытны

(Жыццёвы і творчы шлях)


26. **Абрамчык, А.** Сатырычныя вершы і байкі Кандрата Крапівы : урок беларускай літаратуры (X клас) / Алена Абрамчык // Роднае слова. – 2014. – № 10. – С. 56–58.
27. **Андраюк, С.А.** З народам: Кандрат Крапіва / Серафім Андраюк // Пісьменнікі. Кнігі : літаратурна-крытычныя артыкулы : [для старэйшага школьнага ўзросту] / Серафім Андраюк. – Мінск, 1997. – С. 44–68.
28. **Арочка, М.** Творчы подзвіг сатырыка / М. Арочка // Іменем чалавечнасці / М. Арочка. – Мінск, 1986. – С. 52–59.
29. **Атраховіч, А.** «Даследчыкі забыліся пра Ганну...» : [інтэрв'ю з унучкай К. Крапівы Аленай Атраховіч аб эксклюзіўных фактах біяграфіі знакамітага сатырыка] / запісала Вера Гнілазуб // Сельская газета. – 2015. – № 72 (27 июня) . — С. 31.
30. **Атраховіч, А.** «Дзед быў, як вулкан. Унутры агонь, а зверху– цішыня...» : [інтэрв'ю з унучкай К. Крапівы Аленай Атраховіч аб эксклюзіўных фактах біяграфіі знакамітага сатырыка] / запісала Вера Гнілазуб // Сельская газета. – 2015. – №73 (30 июня). – С. 7.
31. **Атраховіч, А.** «Умяшацца ў жыццё і тое-сёе ў ім паправіць...» : [інтэрв'ю з унучкай К. Крапівы Аленай Атраховіч аб эксклюзіўных фактах біяграфіі знакамітага сатырыка] / запісала Вера Гнілазуб // Сельская газета. – 2015. – №74 (2 июля). – С. 31.
32. **Аўрамчык, М.Я.** Талент перамог асцярожнасць : [успаміны аб жыццёвым і творчым шляху К. Крапівы] / Мікола Аўрамчык // Знаёмыя постаці : [для старэйшага школьнага ўзросту] / Мікола Аўрамчык. – Мінск, 2004. – С. 54–63.
33. **Баршчэўскі, Л.П.** Кандрат Крапіва / Баршчэўскі Л.П., Васючэнка П.В., Тычына М.А. // Словы ў часе і прасторы: літаратура апошняга стагоддзя / Баршчэўскі Л.П., Васючэнка П.В., Тычына М.А. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2015. – С. 117-118.
34. **Бугаёў, Дз.Я.** Яшчэ раз пра Кандрата Крапіву / Дзмітрый Бугаёў // Роднае слова. – 2003. – № 10. – С. 41–48.
35. **Бугаёў, Дз.Я.** А я яму ўдзячны… : (пра Кандрата Крапіву) : [успаміны] / Дзмітрый Бугаёў // Служэнне Беларусі : праблемныя артыкулы,

літататурныя партрэты, эсэ, успаміны / Дзмітрый Бугаёў. – Мінск, 2003. – С. 113–123.
36. **Бугаёў, Дз.Я.** Зброяй сатыры, зброяй праўды. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 231 с.: іл.
37. **Бугаёў, Дз.Я.** Зброяй сатыры, зброяй праўды / Дзмітрый Бугаёў. – 2-е выд., выпраўленае і дапоўненае. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 316 с.
38. **Бугаёў, Дз.Я.** Кандрат Крапіва / Дмітрый Бугаёў // Спавядальнае слова: літаратурная крытыка, успаміны / Дзмітрый Бугаёў. – Мінск, 2001. – С. 147–158.
39. **Бур'ян, Б.** Камедыёграф – гэта лёс / Барыс Бур'ян // Беларусь. – 1996. – № 3. – С. 15 –17.
40. **Весялуха, М.** Каханне і любоў Кандрата Крапівы: рамантычныя і сямейныя гісторыі славутага байкапісца / Марына Весялуха // Звязда. – 2016. – № 43 (5 сак.). – С. 11.
41. **Гніламёдаў, У.** На шляху да «Брамы неўміручасці» : Кандрат Крапіва і яго роля ў беларускай літаратуры / Уладзімір Гніламёдаў // Роднае слова. – 1997. – № 12. – С. 4–12.
42. **Грыдзюшка, Т.** Кандрат Крапіва-байкапісец : (VIII клас) / Т. Грыдзюшка // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 10. – С. 20–23.
43. **Да юбілею Крапівы:** [аб святкаванні 120-годдзя з дня нараджэння К. Крапівы ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа] // Культура. – 2016. – № 10 (5 сак.). – С.12.
44. **Заламай, С.** «Мілы чалавек» і пякучая сатыра: [аб міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства», прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі К. Крапівы] / Сяргей Заламай // Звязда. – 2016. – № 40 (2 сак.). – С. 3.
45. **Замоцін, І.І.** Творчы шлях Крапівы, 1922–1932 / І.І. Замоцін // Творы : літ.-крыт. арт. / І.І. Замоцін. – Мінск, 1991. – С. 288–320.
46. **Казека, Я.** Кандрат Крапіва; Кандрат Крапіва-байкапісец / Янка Казека // Гартаванне слова: выбранае / Янка Казека. – Мінск, 1985. – С. 177–294, 381–400.
47. **Казека, Я.** Кандрат Крапіва : крытыка-біяграфічны нарыс. – Мінск : Беларусь, 1965. – 167 с., 1 л. партр.

48. **Кандрат Крапіва** // Беларускія пісьменнікі-лаўрэаты : рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік / склад. І.У. Смыкава. – Мінск, 1973. – С. 54–60.
49. **Кандрат Крапіва** // Беларускія пісьменнікі (1917–1990): даведнік. – Мінск, 1994. – С. 298–300.
50. **Кандрат Крапіва = Кондрат Крапива.** – Мінск : Беларусь, 1989. – 79 с.: іл. – На беларускай і рускай мовах.
51. **Карабан, У.** Драматургія Кандрата Крапівы. – Мінск : Выдавецтва міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР, 1962. – 79. с.
52. **Каяла, У.І.** Кандрат Крапіва як стваральнік беларускай нацыянальнай байкі / У.І. Каяла // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1999. – № 1. – С. 59–72.
53. **Клімчук, І.** Нястомны працаўнік : літаратурна-музычная кампазіцыя па творчасці Кандрата Крапівы з далучэннем мультымедыа, інсцэніровак баек, урыўка з твора «Хто смяецца апошнім», музычных кампазіцый (песень, экспромта на сінтэзатары) / І. Клімчук, Л. Кокатава // Бібліятэка прапануе. **–** 2012. **–** № 3. – С. 12 –16.
54. **Крапіва (Атраховіч) К.К**. Ад маленства да сталасці // Пяцьдесят чатыры дарогі: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск, 1963. – С. 304–315.
55. **Крапіва Кандрат** // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск, 1994. – С. 268–269.
56. **Крапіва Кандрат** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіса. – Мінск, 1994. – Т. 3. – С. 396–415.
57. **Крапіва Кандрат Кандратавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 451–452.
58. **Крапіва Кандрат Кандратавіч** // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад агул. рэд. А.В. Сабалеўскага. – Мінск, 2002. – Т.1. – С. 536–537.
59. **Крапіва Кандрат Кандратавіч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т.4. – С. 248–249.
60. **Крапіва Кандрат Кандратавіч** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 116–117.

61. **Кучар, А.** Кандрат Крапіва-драматург / А. Кучар // Аблічча часу: артыкулы пра творы народных паэтаў і народных пісьменнікаў / А. Кучар. – Мінск: Беларусь, 1971. – С. 162–208.
62. **Лаўшук, С.С**. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія / С.С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2002. – 252 с.: фат., 1л. партр.
63. **Лаўшук, С.С.** Кандрат Крапіва (1896-1991) / Лаўшук С.С. // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / [навуковыя рэдактары: У. Гніламёдаў, В.А. Каваленка]. – Мінск, 1999. – Т. 2. – С. 282–329.
64. **Лаўшук, С.С**. Смеху ачышчальная сіла / С.С. Лаўшук // Беларуская дзіцячая кніга. – Мінск, 1986. – С. 206–215.
65. **Лепешаў, І.Я.** Эпіграмы Кандрата Крапівы / І.Я. Лепешаў // Дазнанні / І.Я. Лепешаў. – Гродна, 2000. – С. 81–85.
66. **Макарэвіч, А.А.** Сатыра Кандрата Крапівы / Аляксандр Макарэвіч. – Мінск : Белдзяржвыдат, 1962. – 154 с.
67. **Максімовіч, В.А.** Байкі Кандрата Крапівы 20-х гадоў / Валеры Максімовіч // Шыпшынавы край: старонкі беларускай літаратуры 20-30-х гг. ХХ ст. : дапаможнік для настаўнікаў / Валеры Максімовіч. – Мінск, 2002. – С. 74–78.
68. **Навуменка, П.І**. Вёска на раздарожжы: (раман К. Крапівы «Мядзведзічы») / Павел Навуменка // Беларуская літаратура – 1990. – Вып. 18. – С. 78–84.
69. **Навуменка, П.** Невядомы Крапіва: [аб прозе сатырыка] / Павел Навуменка // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 3. – С. 36–41.
70. **Навуменка, П.** Час вяртання даўгоў / Павел Навуменка // Роднае слова. – 1996. – № 3. – С. 3–15.
71. **Паталкоў, Ю.** Адвечнасць, якая перамагае : эмпатычны погляд на п'есу «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы / Юры Паталкоў // Роднае слова. – 2006. – № 11. – С. 12 –16.
72. **Рагаўцоў, В.** Неспецыялізаваныя вербальныя сродкі камічнага ў камедыі «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы / Васіль Рагаўцоў // Роднае слова. – 2014. – № 11. – 39–41.
73. **Рагойша, В.** Пераклаў Кандрат Крапіва: [перакладчыцкая спадчына літаратара] / Вячаслаў Рагойша // Літаратура і мастацтва. – 2016. – № 9 (4 сак.). – С. 3.

74. **Сабалеўскі, А.В.** Кандрат Крапіва / А. Сабалеўскі // Беларуская савецкая драма. Кн. 1. / А. Сабалеўскі. – Мінск: Беларусь, 1969. – С. 119–142.
75. **Сабалеўскі, А.В.** Кандрат Крапіва: нарыс жыцця і творчасці : [для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту] / Анатоль Сабалеўскі. – Мінск : Народная газета, 1989. – 222 с. : фат. – (Народныя пісьменнікі БССР).
76. **Сабалеўскі, А.В.** Кандрат Крапіва: постаць і творы : для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту / Анатоль Сабалеўскі. – 2-е выданне, дапрацаванае і дапоўненае. – Мінск: Народная асвета, 2003. – 304 с. : іл.
77. **Сабалеўскі, А.В.** Творца ў часе і па-за часам : штрыхі да партрэта Кандрата Крапівы / Анатоль Сабалеўскі // Роднае слова. – 2006. – № 2. – С. 6–8.
78. **Свірко, І.** На Канпетры з Крапівой: [да 120-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы] / Ірына Свірко // Рэспубліка. – 2016. – № 42 (5 сак.). – С. 8. –
79. **Свята** беларускай мовы ў аг. Чаркасы. Прысвечанае 120-годдзю з дня народзінаў Кандрата Крапівы // Наша слова. – 2016. – № 9 (2 сак.). – С. 4.
80. **Святлова, Н.** У сатырычны паход да Крапівы: [аб імпрэзе «Дык хто смяецца апошнім?», якая адбылася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН] / Наталля Святлова // Літаратура і мастацтва. – 2016. – № 9 (4 сак.). – С. 8.
81. **Семяновіч, А.А.** Кандрат Крапіва / Семяновіч А.А. // Гісторыя беларускай савецкай драматургіі, 1917–1955 гады / А.А. Семяновіч. – Мінск, 1990. – С. 162–188, 207–233.
82. **Содаль, У.** У Мнішанах, побач з Люцінкай: 100 гадоў з дня нараджэння Кандрата Крапівы / Уладзімір Содаль // Роднае слова. **–** 1996. **–** № 3. **–** С. 164–166.
83. **120 гадоў з дня нараджэння Кандрата Крапівы //** Наша слова. – 2016. – № 9 (2 сак.). – С. 1.
84. **Тападзэ, Л.** Дзівосы Крапівы: [аб унікальных дакументах, падараваных Узденскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П.Труса пляменніцай байкапісца Людмілай Спірыдовіч] / Ліяна Тападзэ // Культура. – 2016. – № 6 (6лют.). – С. 11.

85. **Ускова, Т.** Дзед Кандрат, які змяняў сусвет : што расказалі пра класіка яго родныя, землякі і вучні / Таццяна Ускова // Сельская газета. – 2015. – № 27 (10 марта). – С.15.
86. **Шакун, Л.М.** Творчасць К.К. Крапівы ў асвятленні філалагічнай навукі / Л.М. Шакун // Карані роднай мовы: выбраныя працы па гісторыі беларускай мовы / Л.М. Шакун. – Мінск, 2001. – С. 154–157.
87. **Шлях да брамы неўміручасці** : матэрыялы Рэспубліканскіх навуковых чытанняў, прысвечаных 115-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы (Мінск, 3 сакавіка 2011 года) / [укладальнік А. А. Манкевіч]. – Мінск : Беларуская навука, 2012. –165, [1] с., [7] л. іл.
88. **Шпакова, Ю**. У гонар віцэ-прэзідэнта : цёплыя ўспаміны пра Кандрата Крапіву дапоўнілі навукоўцаў : у Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшла міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства» / Юлія Шпакова // Літаратура і мастацтва. – 2016. – № 10 (11 сак.). – С. 10.

89. **Атрахович Кондрат Кондратович (Кондрат Крапива)** // Национальная академия наук Беларуси : персональный состав / составитель : О.А. Гапоненко [и др.]. – 3-е изд., дополненное и переработанное. – Минск, 2003. – С. 16–17.
90. **Гилевич, Н. С.** Мастерство баснописца : [басни К. Крапивы] / Нил Гилевич // В это верю / Нил Гилевич. – Москва: Советский писатель, 1986. – С. 44–65.
91. **Карпович, О.** Человек, который смеялся: [Кондрат Крапива - сатирик] / Олег Карпович // Советская Белоруссия. – 2016. – № 38 (27 февр.). – С. 7.
92. **Катаева, Н.** Крапива для обормотов : в Посольстве Беларуси в России открылась выставка, посвящённая 120-летию народного писателя Кондрата Крапивы / Нина Катаева // Народная газета. – 2016. – № 6 (12 лют.). – С. 13 (тетр. 2).
93. **Рублевская, Л.** Музы баснописца : [из воспоминаний внучки и правнучки Кондрата Крапивы] / Л. Рублевская // Советская Белоруссия. – 2011. – № 43 (5 марта). – С.10.
94. **Рублевская, Л.** Семь ценных фотографий Кондрата Крапивы: [предоставлены внучкой сатирика Еленой Атрохович] / Людмила

Рублевская // Советская Белоруссия. – 2016. – № 43 (5 марта). – С. 12–13.

95. Шибковская, Д. Семь дней из жизни белорусского Мольера:[жизненный путь К. Крапивы] / Диана Шибковская // 7 дней. – 2016. – С. 28–29.